**УДК 902.26(476)**

# ПЛАНІГРАФІЯ ЎСХОДНІХ РАСКОПАЎ 2 І 3 НА ВЕРХНІМ ЗАМКУ СТАРАЖЫТНАГА ПОЛАЦКА

***А.Л. Коц***
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай, Рэспубліка Беларусь

*У артыкуле разгледжана гісторыя правядзення раскопак у 1959-1962 гг. на Верхнім замку г. Полацка. Прадстаўлены чарцяжы раскопаў 2 і 3, якія апублікаваны ў навуковай літаратуры і выяўленыя сярод матэрыялаў Г.В. Штыхава, А.Р. Мітрафанава і Л.Д. Побаля ў архіве Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Абагульненне інфармацыі па ўсіх вядомых чарцяжах дазволіла зрабіць некаторыя заўвагі наконт фарміравання забудовы Верхняга Замка ў Полацка ў XIII–XIV стст. і ўдакладніць датыроўкі напластаванняў.*

***Ключавыя словы**: археалагічныя даследаванні, раскопкі, Верхні замак, Полацк, стратыграфічны гарызонт, план раскопа, Георгі Васільевіч Штыхаў.*

**Уводзіны**. Археалагічныя даследаванні Полацка налічваюць без малога 100 гадоў. А калі ўлічыць, што першыя шурфоўкі Полацкай Сафіі былі праведзены яшчэ ў дарэвалюцыйны час, то і большы адрэзак часу. У плеядзе ўсіх даследаванняў, навуковае вывучэнне Верхняга замка займае адно з самых ключавых месцаў у археалагічнай навуцы "бацькі беларускіх гарадоў". Менавіта на Верхнім замку былі праведзены адны з першых археалагічных даследаванняў горада і 2020-2022 гады таксама адзначыліся самымі маштабнымі археалагічнымі працамі за апошнія дзесяцігоддзі. Пераважная большасць археалагічных даследаванняў Верхняга замка адбывалася пры правядзення пэўных мерапрыемстваў, у тым ліку і будаўнічай дзейнасці. Шэраг раскопак абумоўлены будаўніцтвам новых карпусоў бальніцы, пракладкай новых камунікацый, рамонтам будынкаў і сучаснай рэканструкцыяй карпусоў бальніцы пад кадэцкае вучылішча. Актыўныя даследаванні Сафійскага сабора былі праведзены з нагоды рэстаўрацыйных прац і прыстасаваннем помніка пад музей і канцэрную залу. Вялікія археалагічныя даследаванні ў канцы 1950-1960-ых гг. былі выкліканы мэтанакіраванымі даследаваннямі Полацка перад яго святкаваннем 1100-ых угодкаў. Тым не менш шэраг раскопак (у 1967 г. Г.В. Штыхава, у 1979-1980 гг. Вас.А. Булкіна, у 1990-ыя гг. С.В.Тарасава і М.В. Клімава і інш.) мелі на мэце і навуковыя інтарэсы.

Сёння нельга дакладна вызначыць плошчу і аб'ём даследаванай часткі Верхняга замка (з улікам найноўшых даследаванняў), але варта адзначыць, што ўжо археалагічнымі раскопкамі і наглядамі ахоплена значная плошча помніка. Тым не менш не стае інфармацыі для вызначэння агульнай карціны жылой і культавай забудовы Верхняга замка ў розныя часы. На сённяшні дзень досыць дакладна можна толькі акрэсліць характар культурных напластаванняў і ахактарызаваць матэрыяльную культуру яго насельнікаў.

**Асноўная частка.** Найбольшы культурны пласт вызначаецца ва ўсходняй частцы Верхняга замка. Тут ён дасягае магутнасці да 5,5 метраў. Упершыню гэта было вызначана ў часе археалагічных раскопак 1959-1962 гг., калі на тэрыторыі бальніцы было закладзена два вялікія раскопы.

У 1962 годзе ў Полацку планавалася правесці буйнамаштабнае святкаванне 1100-угодкаў горада. У рамках святкавання была запланавана навуковае выданне, якое у далейшым выйшла пад назвай "Полоцк. Исторический очерк" [2]. У межах гэтага праекта у Полацку былі запланаваны археалагічныя даследаванні, якія мелі на мэце падцвердзіць факт старажытнага існавання горада, удакладніць тапаграфію Полацка, вызначыць самае старажытнае месца гарадскога пасялення і інш.

У пасляваенны час першыя раскопкі культурнага пласта жылой зоны былі праведзены М.К. Каргерам у 1957 г. на месцы будаўніцтва інфекцыйнага корпуса (у будучым роддома) на Верхнім замку. А ўжо ў 1958 г. была арганізавана Полацкая археалагічная экспедыцыя Інстытута гісторыі АН БССР. Раскопкі былі праведзены ў 1958 г. побач з Сафійскім саборам (на захад ад храма) пад кіраўніцтвам А.Р. Мітрафанава. З 1959 г. ладзіліся раскопкі ва ўсходняй частцы Верхняга замка і шурфоўкі на тэрыторыі помніка і ўсяго горада. У 1959-1962 гг. было закладзена і даследавана два вялікіх раскопа побач з інфекцыйным корпусам, якія ў працяг нумарацыі 1958 г. атрымалі №№ 2 і 3. У 1967 г. Г.В. Штыхавым быў закладзены яшчэ адзін раскоп на тэрыторыі бальніцы, які атрымаў №4. За ўсю гісторыю археалагічнага вывучэння Верхняга замка раскопы 2 і 3 з'яўляюцца самымі вялікімі і аб'ёмнымі па даследаваннях культурных напластаванняў помніка. Спачатку кіраўніком раскопак з'яўляўся А.Р.Мітрафанаў [Тарасаў], потым да яго далучыўся В.Р. Тарасенка, а затым да экспедыцыі далучаецца Г.В. Штыхаў. Пад час раскопак быў атрыманы вялікі аб'ём ведаў аб гісторыі горада, але, на наш погляд, ён нябыў асвечаны належным чынам ў навуковай літаратуры. Акрамя прыгаданай працы, А.Р. Мітрафанаў, Г.В. Штыхаў і В.Р. Тарасенка падрыхтавалі некалькі навуковых даследаванняў па жылой забудове, тапаграфіі, матэрыяльнай культуры, сельскагаспадарчым і рамесным развіцці Полацка і інш. Але яны засталіся не надрукаванымі і ў выглядзе рукапісаў захоўваюцца ў фондзе археалагічнай навуковай дакументацыі Цэнтральнага навуковага архіва Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Вынікі раскопак былі ўведзены ў навуковы зварот Г.В. Штыхавым у манаграфіі "Древний Полоцк". Тым не менш аб'ёмы даследаванняў раскопаў 2 і 3 былі каласальныя і вялікі пласт інфармацыі не патрапіў у навуковы зварот. Так, шмат знаходак засталіся без увагі публікацый, вельмі сцісла ахарактэрызавана забудова Верхняга замка, няма дастатковай колькасці выяў артэфактаў і планаў раскопак. Зразумела, што раскрыць усё інфармацыйнае поле зафіксаваных дадзеных немагчыма аднаму даследчыку, таму пераасэнсаванне вынікаў раскопак, аналіз атрыманых матэрыялаў, публікацыя знаходак і планаў раскопаў - гэта праца сучасных навукоўцаў і паслядоўнікаў. Тым больш, што праведзеныя побач даследаванні ў 2021-2022 гг. экспедыцыяй Інстытута гісторыі НАН Беларусі пад кіраўніцтвам М.В. Клімава даюць магчымасць зрабіць шэраг удакладненняў адносна вынікаў даследаванняў 1959-1962 гг. Аналіз архіва Г.В. Штыхава, які захоўваецца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі і асобныя матэрыялы, якія знаходзяцца на захаванні ў фондах Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка паказвае, што шмат сабраных дадзеных належыць да грунтоўнай апрацоўкі і вывучэння.

Дадзеная публікацыя мае на мэце ўводу у навуковы зварот усіх вызначаных аўтарам планаў гарызонтаў раскопаў 2 і 3 і іх сцісласы аналіз.

Раскоп 2 знаходзіўся побач з будынкам анкалагічнага (пазней радзільнага) корпуса, за 10 метраў ад яго [Штыхов, с. 37]. Такая лакалізацыя дастаткова дакладна вызначае месца раскопа, але прывязаць яго да мясцовасці немагчыма. Аналіз сабранай інфармацыі, у тым ліку і вусныя сведчанні некаторых удзельнікаў тых раскопак, дазволілі вызначыць дакладнае месца раскопаў 2 і 3. Ад паўднёва-ўсходняга кута раскопа 2 да паўднёва-заходняга кута будынка бальнічнага корпуса 15 м і ад паўночна-ўсходняга кута раскопа 2 да паўночна-заходняга кута будынка амаль 20 м. Дадзеная лакалізацыя была падцверджана пад час раскопак М.В. Клімава ў 2021 г. пад катлаван новага будынка, у які часткова ўвайшоў і раскоп 2. Плошча раскопа 2 складае 320 м$^2$, пры памеры 20х16 м, была разбіта на 80 квадратаў. Аналагічныя памеры меў і раскоп 3 [Штыхов, с. 37].

Часткова планы чарцяжоў раскопаў 2 і 3 можна знайсці ў публікацыях. Так, планы гарызонтаў 6 і 9 змешчаны ў даследаванні Г.В. Штыхава [с. 39, 44]. Некаторыя чарцяжы апублікаваны Георгіем Васільевічам ў калектыўнай манаграфіі “Полоцк” з серыі “Древнейшие города Беларуси” (гарызонты 3, 5, 7, 8, 9, 13 раскопа 2) [с. 194-197, 218]. Тым не менш не стае асобных планаў і да таго ж апублікаваныя чарцяжы не ўпісаны ў агульную карціну раскопак. У архіве Г.В. Штыхава атрымалася выявіць яшчэ некаторыя недастаючыя матэрыялы. Месца захавання палявых чарцяжоў на мілімітроўцы і прамалёўкі планаў раскопаў 2 і 3 не вызначана. Існуюць толькі чыставыя малюнкі на фотапаперы. Чарцяжы гарызонтаў 1 і 2 таксама не выяўлены. У раскопеп 2 гарызонт 1 драўляных канструкцый амаль што не меў. Вызначаецца, што гарызонт 2 цалкам паўтараў больш ранні 3 гарызонт для якога існуе толькі чарцёж раскопа 2 [Штыхов, Древній Полоцк, с. 38], які быў зроблены пад кіраўніцтвам А.Р. Мітрафанава. Праведзена дакладнае апісанне пабудоў дадзенага гарызонта. У раскопе 3 гарызонты 1-3 не захаваліся [Штыхов, Древній Полоцк, с. 38],

Пабудовы гарызонта 3, як і гарызонтаў 1, 2 і 4 датуюцца шырока ў межах XIV-канца XVII стст. І пазначаецца, што яны загінулі ў пажары [с. 38]. Параўноўваючы планы 3, 4, 5, і 6 гарызонтаў, можна зрабіць выснову аб захаванні планіроўкі надзелаў па слядах агароджаў і агульнаму накірунку забудовы, якая прывязвалася да абарончага вала. Такім чынам, на наш погляд гарызонты 3 і 4 больш мэтазгодна набліжаць да датыроўкі XIV ст., калі яшчэ магла захоўвацца папярэдняя сістэма забудовы Замка, але наўрадце яна магла праіснаваць некалькі стагоддзяў у нязменным выглядзе. Па ўскосным дадзеным Г.В. Штыхава ў раскопе 2 прасочваецца верхні гарызонт насціла вуліцы. Усяго даследчык вызначае 7 ярусаў вуліцы.

Гарызонт 4 у пэўнай ступені паўтарае забудову папярэдняга этапу існавання забудовы. Пры чым адзначана, што памеры пабудоў амаль што тыя ж, як і ў гарызонце 3. Тут зафіксаваны пабудовы жылога і гаспадарчага назначэння, у тым ліку, мяркуецца, і свірн. Шэраг пабудоў мае два насцілы падлогі, пакладзеныя на скразныя ўрубкі [с. 38].

Гарызонт 5 у раскопе 3 прадстаўлены дрэнназахаваўшыміся рэшткамі асобнага бярвення і жэрдак [с. 38]. У раскопе 2 драўляныя канструкцыі захаваліся лепей і паўтараюць палажэнне забудовы наступнага перыяду: агульны накірунак будынкаў ў 5-ым гарызонце захоўваецца. А.Р. Мітрафанаў выказаў меркаванне, што пабудовы гэтага перыяду мелі часовы характар і былі пабудаваны як часовыя для перажывання вынікаў пажару [с. 38]. 5-ы гарызонт прадатаваны мяжой XIII–XIV стст. [с. 53].

Пабудовы гарызонта 6 загінулі ў моцным пажары. Варта адзначыць, што ў 6 гарызонце дакладна прасочваецца планіроўка вуліцы і, магчыма, завулка. Вуліца мела дрэнажную канаву і пашыралася ў заходнім накірунку, дзе магла пераходзіла ў плошчу ці выходзіла на перакрыжаванне. Абапал вуліцы выяўлены частакол, за якім размяшчалася забудова сядзіб. Дataванне дадзенага гарызонта прыведзена ў межах 60-70 гадоў XIII стст. [с. 40, 52].

Гарызонт 7 паўтарае тую ж канфігурацыю забудовы і накірунак вуліцы, але па планам бачна, што мяркуемы завулак не прысутнічае. На яго месцы, на аддаленні каля 6 метраў ад насціла вуліцы, размяшчаецца пабудова. Датаванне забудовы азначага гарызонт вызначана межамі 50-60-ых гг. XIII ст. [с. 53].

У 8 гарызонце адбываецца паўтор размяшчэння будынкаў суседніх гарызонтаў. Варта адзначыць, што некаторыя зрубы існуюць працяглы час і сустракаюцца ў некалькіх часавых перыядах. На датаванне 8 гарызонта прыпадаюць 50-ыя гг. XIII ст. [с. 53].

Да 9 гарызонта адносяцца найбольш раннія рэшткі вулічныя маставой. Асобныя пабудовы загінулі ў пажары [с. 43]. 9-ы гарызонт самы першы этап будаўніцтва пасля кардынальных змен, якія адбыліся ў забудове Верхняга замка на мяжы 30-40-ых гг XIII ст. Забудову 9-га гарызонта Г.В. Штыхаў пазначае як 40-ыя гг XIII ст. [с. 53].

Гарызонты 10-13 маюць іншы накірунак забудовы ў параўнанні з наступнымі перыядамі жыццядзейнасці на Замку. Будынкі меншага памеру і іх захаванасць значна горшая. Забудова не прасочваецца на ўсю плошчу раскопаў. Але ў гарызонце 11 зафіксавана агароджа, на аснове якой лакалізавана вуліца. Азначаная вуліца ніяк не звязана з маставой наступнага перыяду. Датуюцца гарызонты наступным чынам: X – 30-ыя гг. XIII ст, XI – 20-ыя гг. XIII ст., XII – пачатак XIII ст., XIII – мяжа XII-XIII стст. [с. 53]. Нажаль чарцяжоў 12 і 13 гарызонтаў раскопа 3 не выяўлена. Наступны гарызонт пад № 14 прадстаўлены фрагментамі асобных пабудоў, але для яго, відавочна, таксама не быў складзены асобны план. Ніжнія пласта раскопаў 2 і 3 маюць дрэнную захаванасць драўніны і ў іх не вылучалася будаўнічых гарызонтаў [с. 48-49].

**Заключэнне.** Такім чынам, апрацоўка матэрыялаў раскопак, праведзеных некалькі дзесяцігоддзяў таму, дазваляе зрабіць ўдакладненні адносна высноў і характару культуранага пласта. Дзякуючы праведзеным даследаванням мы ведаем аб наяўнасці самага магутнага культурнага пласта ў Полацку, які дасягае 5,5 м, выдатнай захаванасці арганічных рэчываў у культурным пласце Верхняга замка, шэраг дэталяў драўлянай забудовы сярэднявечнага Полацка, якая фарміравалася пагонна-вулічнай сістэмай. На аснове планіроўкі надзелаў і захаванасці сістэмы забудовы, прывязанай да абарончага вала, гарызонты 3, 4 і 5 мэтазгодна набліжаць да датыроўкі XIV ст. Але нажаль, шэраг дадзеных, атрыманых пад час раскопак Полацка ў 1950-1960-ыя гг., былі не апублікаваны. Храналогія напластаванняў, зробленая па выніках даследаванняў раскопаў 2 і 3, з’яўляецца супярэчлівай і патрабуе ўдакладненняў. Зварот да палявых запісаў, архіваў даследчыкаў і калекцый знаходак з ўлікам найноўшых даследаванняў дазволяць зрабіць новыя адкрыцці.

### Спіс выкарыстаных крыніц


1. Полоцк: Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX-XIII вв., летопись древних слоёв, Полоцк и его округа в XIV-XVIII вв., ремесло, денежное обращение и торговые связи Полоцка в средневековье (по данным археологии, нумизматики и письменных источников), культура и просвещение в средневековом Полоцке / О.Н. Левко [и др.]; редкол.: А.А. Коваленя (гл. ред.); науч. ред. О.Н. Левко – Минск: Беларус. Навука, 2012. – 743 с.

2. Полоцк: исторический очерк. К 1100-летию города Полоцка / под редакцией И. Кравченко и Н. Каменской – Минск, 1962. – с. 278.
3. Тарасаў, С. В. Раскопкі А. Р. Мітрафанава ў Полацку ў 1958 – 1960 гг. у святленовых дадзеных / С. В. Тарасаў // Насельніцтва Беларусі і сумежных тэрыторый у эпохужалеза. Тэзісы дакладаў канферэнцыі, прысвечаных 80-годдзю з дня нараджэння А. Р. Мітрафанава (10 – 12 снежня 1992 г.). – Мінск : МП “ЭПИКО”, 1992 б. – С. 16 – 18А.Р.
4. Штыхаў, Г.В. А. Р. Мітрафанаў – даследчык Полацка: пытанні датавання культурных напластаванняў Верхняга замка / Г.В. Штыхаў // ГАЗ. – 2013. – № 28. – С. 289-291
5. Штыхов, Г.В. Древний Полоцк (IX-XIII вв.) / Г.В. Штыхов. – Минск: Наука и техника, 1975. – 136 с.

## PLANIGRAPHY OF THE EASTERN EXCAVATIONS 2 AND 3 AT THE UPPER CASTLE OF ANCIENT POLOTSK

***A. Kots***

*The scientist considers in the article the history of archaeological research in 1959-1962. The researcher presented drawings of excavations 2 and 3 from scientific publications and archives of researchers Shtykhov, Mitrofanov and Pobal at the Institute of History of the National Academy of Sciences of the Republic of Belarus. The author of the article specified the dating of the Upper layers during the analysis and details of the residential development of the Upper Castle.*

***Keywords***: *archaeological research, excavations, Upper Castle, Polotsk, stratigraphic horizon, excavation plan, Giorgi Shtikhov.*




**Малюнак 1. – Планіграфія гарызонта 3 усходніх раскопаў 2 і 3 (1959-1962 гг.)**




**Малюнак 2. – Планіграфія гарызонта 4 усходніх раскопаў 2 і 3 (1959-1962 гг.)**



**Малюнак 3. – Планіграфія гарызонта 5 усходніх раскопаў 2 і 3 (1959-1962 гг.)**



**Малюнак 4. – Планіграфія гарызонта 6 усходніх раскопаў 2 і 3 (1959-1962 гг.)**



Малюнак 5. – Планіграфія гарызонта 7 усходніх раскопаў 2 і 3 (1959-1962 гг.)



Малюнак 6. – Планіграфія гарызонта 8 усходніх раскопаў 2 і 3 (1959-1962 гг.)




**Малюнак 7. – Планіграфія гарызонта 9 усходніх раскопаў 2 і 3 (1959-1962 гг.)**




**Малюнак 8. – Планіграфія гарызонта 10 усходніх раскопаў 2 і 3 (1959-1962 гг.)**




**Малюнак 9. – Планіграфія гарызонта 11 усходніх раскопаў 2 і 3 (1959-1962 гг.)**




**Малюнак 10. – Планіграфія гарызонта 12 усходніх раскопаў 2 і 3 (1959-1962 гг.)**




**Малюнак 11. – Планіграфія гарызонта 13 усходніх раскопаў 2 і 3 (1959-1962 гг.)**